УДК 630*231.1

У.В. Буцькавец, асп.
(ДНУ “Інстытут лесу НАН Беларусі”, г. Гомель)

# РАЗМЕРКАВАННЕ ПАДРОСТА ЕЛКІ ПАД ПОЛАГАМ НАСАДЖЭННЯЎ

З мэтай вызначэння паспяховасці прыроднага ўзнаўлення елкі пад полагам насаджэнняў, намі былі прааналізаваны ўсе прысьпяваючыя і саспелыя дрэвастаны 12 лягсасаў краіны, агульнай плошчай 324,8 тыс. га. Падрост елкі ўлічваўся ў 9-ці найбольш спрыяльных серыях тыпаў лесу: імшыстая з эдафатопам $Б_2$, брусьнічная, арляковая, кісьлічная, чарнічная, сныцевая, крапіўная, папаратнікавая і прыручэйна-травяная.

Мы высветлілі, што ўсяго падрост елкі пад полагам насаджэнняў маецца на плошчы 62,8 тыс.га, што складае 19,3% ад агульнай плошчы. Асноўная маса падроста, гэта 91%, сканцэнтраваны ў арляковай, кісьлічнай і чарнічнай серыях тыпаў лесу. У дрэвастанах з адноснай паўнатой 0,7 знаходзяцца 52% усяго падроста елкі, з паўнатой 0,6 – 28%. Нягледзячы на адсутнасць елкі ў саставе матчынага дрэвастана, падрост елкі пад полагам такіх насаджэнняў прадстаўлены на плошчы 10,3 тыс.га, што складае 16,3% усяго падроста. У насаджэннях з 1 адзінкай елкі ў саставе, падрост маецца на плошчы 13,5 тыс. га (21,4%).

Пры аналізе залежнасці гушчыні падроста ад каэфіцыента састава і адноснай паўнаты дрэвастанаў бачна, што вялікіх адрознень няма. Найбольшая доля густога падроста маецца ў дрэвастанах з 2 адзінкамі елкі ў саставе (18,0%), найменшая – з 5 адзінкамі (10,9%). У залежнасці ад паўнаты доля густога падроста вар’іруе ад 13 да 23%. Размеркаванне гушчыні падроста ў залежнасці ад серый тыпаў лесу паказвае, што густы падрост елкі амаль адсутнічае ў крапіўнай і брусьнічнай серыях, а ў арляковай, кісьлічнай і чарнічнай яго доля набывае максімальныя значэнні.

Калі параўнаць долю насаджэнняў з падростам елкі і насаджэнняў без падроста, то можна зрабіць вывад, што найбольш спрыяльнымі для ўзнікнення яловага падроста з’яўляюцца арляковая, чарнічная і кісьлічная серыі тыпаў лесу. З памяншэннем адноснай паўнаты дрэвастану верагоднасць узнікнення яловага падроста можа павысіцца на 9%. Чыстыя яловыя насаджэнні не з’яўляюцца спрыяльнымі для ўзнікнення падроста елкі. З большай верагоднасцю падрост узнікае ў дрэвастанах з удзелам елкі ў саставе 3-4 адзінак.